**Гавяйновіч, В.** Жыццё без вайны / В. Гавяйновіч // Полацкі веснік. — 2008. — 15 лют. — С. 1.

**ЖЫЦЦЁ БЕЗ ВАЙНЫ**

*Учора Уладзімір Іванавіч Арцямёнак адзначыў свой чарговы дзень нараджэння, 39-ы па ліку. Сёння ў яго жыцці яшчэ адна дата, як і ў тысяч салдат, што прымалі ўдзел у баявых дзеяннях у Афганістане – Дзень памяці. Хаця, калі шчыра, Уладзімір Арцямёнак не любіць успамінаць. І дакументальных фільмаў пра баявыя дзеянні не глядзіць. Тады наплываюць успаміны: іх блокпост пад Кундузам, забітыя салдаты і гарачае афганскае сонца. Там і ў цяньку днём такая нясцерпная гарачыня... Увечары байцы, хто не стаяў на пасту, мачылі прасціны ў халоднай вадзе і пад імі клаліся спаць. Побач аўтамат, два ражкі з патронамі. Праз некалькі гадзін прасціна высыхала і пачынала хрусцець...*



У маі 1988 года, пасля вучэбкі ва Узбекістане, яго накіравалі ў Афганістан для падтрымкі вываду савецкіх войскаў. Ён – радавы стралок, пяхота, трапіў на блокпост пад Кундузам. Іх маленькая застава была часцінкай далёкай Радзімы, баявым брацтвам на бяскрайніх афганскіх прасцягах. Для кожнага гэта быў апошні рубеж, умацаваны, канечне, і слабы адначасова. А яны, учарашнія школьнікі, савецкія салдаты (там ніхто не цікавіўся пра нацыянальнасць, такая дробязь неістотная на вайне) гэтую пядзю зямлі абаранялі, як сваю. Такі быў загад, а загады салдаты не абмяркоўваюць. Праўда, было ў іх адно адступленне ад армейскага статуту – яны па ім не звярталіся адзін да аднаго. На гэтай баявой кропцы былі адзінай сям'ёй, адзіным арганізмам, толькі гэта давала надзею, што выжывуць.

Духі блокпост абстрэльвалі рэгулярна. Былі параненыя. Але першая чорная вестка прыйшла, калі іх салдаты на БМП паехалі сустракаць бензавоз, каб суправадзіць да блокпаста.

Ракетай баявую машыну душманы падарвалі, салдат расстралялі. Каб прынесці больш болю жывым, расстралялі крыжападобна. Укрыжавалі. На яго памяці гэта быў першы «груз 200». Пасля быў яшчэ адзін падобны.

А яны працягвалі абараняць гэтую пядзю афганскай зямлі дзень і ноч. Побач было афганскае паселішча, і часам дзеці прыходзілі прасіць ежу. Салдаты дзяліліся, але падыходы да блокпаста былі замініраваны, і аднойчы, калі Уладзімір стаяў у дазоры, ўбачыў двух малых. Адзін прайшоў без перашкод, другі падарваўся на міне. Медыкі малога вынеслі, перавязалі і накіравалі ў шпіталь.

Уладзімір Арцямёнак праз тры месяцы пакідаў Кундуз на самалёце. Большая палова салдат іх блокпаста выходзіла з Афганістана на тэхніцы. Дарога не для ўсіх была шчаслівай: духі стралялі ўслед.

Адслужыўшы ў арміі, Уладзімір Арцямёнак вярнуўся дамоў ў Глыбачку, што на Ушаччыне. Спачатку працаваў у калгасе імя Сільніцкага, а дзесяць гадоў назад іх сям'я пераехала ў СВК «Астроўшчына». У вёсцы Жаўнова далі катэдж, і яны – Уладзімір Іванавіч, жонка Надзея, сын Генадзь і дачка Наталля – тут шчасліва жывуць. Генадзь – галоўны памочнік у бацькі-механізатара, тэхніку любіць, умее кіравацьтрактарам. Вясковыя дзеці заўсёды вучацца ля бацькоў.

...Вярнуўшыся з вайны Уладзімір Арцямёнак не глядзіць дакументальных фільмаў пра вайну. Успамінаецца блокпост, абстрэлы, маладыя твары загінуўшых салдат і сонца, такое нясцерпна гарачае афганскае сонца...

**Вольга ГАВЯЙНОВІЧ**
*Фота Анатоля ДУБАТОЎКІ*